ПАРАЛІ́КІ, ліхія духі, якія ў адрозненне ад інш. нячысцікаў апаноўваюць ахвяру не адразу, а падступаюцца да яе спадцішка, часам на працягу некалькіх гадоў. Іх улюбёныя абранцы - людзі старэй сярэдняга веку. Дзейнічаюць слабыя П. толькі ў гурце, як і паветрыкі, працуючы паперамення, а пры супраціўленні ахвяры — разам. Чалавек пазнае прысутнасць П. толькі тады, калі яны зжыліся з ім, і адпрэчыць іх ужо няма ніякай магчымасці. П. даймаюць галоўным чынам цела чалавека, а з ім іх ахвяраю становіцца і яго душа. Аддаляюцца П. гэтак жа павол!, як і падступаліся, — няспешна, вяртаючыся час ад часу.

*Літ.:* Никифоровский Н.Я. Нечистики: Свод простонар. в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе. Витебск, 1995. С. 31.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ